ПРОЛЕТАРЫ УСІХ КРАЁЎ ЗЛУЧАЙЦЕСЯ!

Чырвоная Зьмена

№ 3 (971) | СУБОТА, 4-га студзеня 1930 г.

ШТОДЗЁННАЯ ГАЗЭТА РАБОЧА-СЯЛЯНСКАЙ МОЛАДЗІ
Орган ЦК і Менскага АК ЛКСМБ
УМОВЫ ПАДПІСКІ:

1 месяц	30 кап.
3 месяцы	90 "
6 месяцаў	1 р. 80 "
1 год	3 р. 30 "

АДРАС РЭДАКЦЫІ:
Менск, вул. Карла Маркса, 38
Тэлефоны: рэдактара—7-25,
сэкратарыят—12-19.
АДРАС КАНТОРЫ:
Комсамольская 25, тэлеф. № 903.

ГОД ВЫДАНЬНЯ IX.

Адчыніўся пленум ЦК КП(б)Б

Учора адчыніўся пленум ЦК КП(б)Б. Прыбыла дэлегацыя ад Сормаўскага заводу ў колькасьці 4-х чалавек. Гэтыя 4 дэлегаты з ліку 100 мобілізаваных рабочых для працы ў калгасах.

Пленумам абран першым сакратаром тав. Гей. Пленум заслухаў даклад тав. Рач цкага аб суцэльнай колектывізацыі сельскай гаспадаркі БССР і задачах веснавой сельска-гаспадарчай кампаніі.

Дамо індустрыі мільёны

Лістападаўскі пленум ЦК УсеЛКСМ асабліва чотка падкрэсьліў, што комсамол павінен падцягнуць тэмпы сваёй работы да тэмпаў гаспадарчага будаўніцтва.

Тэмпы нашага будаўніцтва надзвычайна высокія. Соцыялістычнае спаборніцтва паказала вялізарную ініцыятыву і магутную сілу рабочае клясы. Яно ў значнай меры садзейнічала правышэньню нашых плянавых меркаваньняў, якія былі прадугледжаны першым годам пяцігодкі.

Прамысловасьць правысіла выпуск продукцыі у 1928-29 годзе у параўнаньні з мінулым годам на 24 проц. Капітальныя укладаньні у прамысловасьць на другі год пяцігодкі павялічваюцца з 1.65 мільёнаў р. да 3.20 мільёнаў р., аб'ём капітальнага будаўніцтва у 1929-30 годзе будзе у два разы правышаць капітальнае будаўніцтва першага году пяцігодкі. У вёсцы мы маем нябачаныя тэмпы совгаснага і колгаснага будаўніцтва. Шматмілёнпыя масы батрацтва, беднаты і серадняцтва пайшлі ў колгасы. Тэмпы колгаснага будаўніцтва далёка пакінулі за сабою нашыя плянавыя меркаваньні. Растуць новыя волаты сельскай гаспадаркі, совгасы, колгасы. Растуць вышэйшыя формы колектывізацыі сельскай гаспадаркі —комуны.

Гэтыя вялізарнейшыя посьпехі нашага соцыялістычнага будаўніцтва разьбіваюць ушчэнт тэорыю правых опортуністых аб непасільных тэмпах індустрыялізацыі, аб дэградацыі сельскай гаспадаркі, аб непатрэбнасьці колгаснага і совгаснага будаўніцтва.

Усе нашыя капітальныя уклады у прамысловасьць і сельскую гаспадарку ідуць выключна за лік унутраных сродкаў краіны без дапамогі буржуазных капіталістычных дзяржаў. Адсюль відавочна, што перад рабочай клясай і асноўнымі масамі сялянства стаяць надзвычайна складаныя задачы па мобілізацыі сіл, энэргіі на справу соцыялістычнага будаўніцтва. Прыцягненьне і мобілізацыя вольных сродкаў насельніцтва на справу нашага будаўніцтва займае значнае мейсца ў агульнай сыстэме нашай гаспадарчай работы.

Комсамольская організацыя, якая зьявілася застрэльшчыкам соцспаборніцтва—гэтай вялікай рэволюцыйнай справы на фронце соцыялістычнага будаўніцтва павінна таксама адыграць вялізарную ролю ў справе прыцягненьня вольных сродкаў насельніцтва на агульную справу індустрыялізацыі краіны, соцыялістычнай рэконструкцыі сельскай гаспадаркі.

Пачын менскага акругкому комсамолу і ячэйкі банкаўскіх установ зьяўляюцца каштоўным укладам у вопыт комсамольскай работы у галіне пашырэньня ашчаднасьці сярод працоўнага насельніцтва.

Комсамольскія організацыі павінны шырока скарыстаць гэты вопыт, скарыстаўшы яго у сваёй штодзённай рабоце.

На вялікі жаль мы павінны са ўсёй рашучасьцю падкрэсьліць, што маса комсамольцаў у цэлым прымае вусім слабы удзел у гэтай справе. Частка ячэяк комсамолу асабліва у вёсцы—часамі яшчэ ня лічыць работы па прыцягненьню вольных сродкаў насельніцтва сваёй важнейшай галіной работы. Базумоўна, што такія погляды, і такія адносіны да гэтай справы нічога агульнага ня маюць з устаноўкай комсамольскай організацыі у адносінах падначаленьня ўсёй сыстэмы, форм і мэтадаў работы комсамолу да задач соцыялістычнага будаўніцтва.

Перад кожнай комсамольскай ячэйкай райкомам, кожным комсамольцам стаяць конкрэтныя задачы, прыняцьця актыўнага ўдзелу ва ўсіх порах нашай упартай гаспадарчай работы.

Працоўныя касы ашчаднасьці шырокая работа ўсёй савецкай грамадзкасьці вакол іх набываюць не малаважнае значэньне. Вакол іх работы мы павінны згрупаваць свой актыў, масы комсамольцаў і беспартыйнай моладзі. Патрэбна шырока распаўсюдзіць вопыты работы комсамолу і на гэтую галіну работы.

Організаваць шэраг ініцыятыўных добраахвотных груп у ячэйках, стаць актыўнымі організатарамі і пропагандыстамі ў справе ашчаднасьці, узяць пад комсамольскі «абстрэл» работу працоўных мас ашчаднасьці, накіраваць работу груп „Лёгкай Кавалерыі" на зьнішчэньне маючыхся недахопаў, організаваць групы ударнікаў-комсамольцаў, якія беражна хаваюць і аддаюць кожную вольную капейку на справу індустрыялізацыі, быць актыўнымі правадырамі і організатарамі масавых мерапрыемстваў - папулярызіруючы работу працоўных ашчадных кас сярод насельніцтва,—вось што павінна быць узята ў асяродак работы ячэяк комсамолу.

Мы павінны рашуча ўзяцца за гэтую справу. Комсамольскім напорам і энтузіазмам, упартай сыстэматычнай работай, шырокім уцягненьнем працоўных мас у справы ашчаднасьці мы дамо новыя ўклады ў справу соц. будаўніцтва.

Грамадзяне СССР вызвалены з кітайскіх турам

Паведамленьне ТАСС

Па вестках атрыманых ад часова-выконваючага абавязкі генэральнага консула СССР у Харбіне, 31 сьнежня вызвалены ўсе савецкія грамадзяне, арыштаваныя кітайскай уладай у часе конфлікту, роўна як і арыштаваныя ў часе налёту на савецкае генэральнае консульства ў Харбіне.

У адпаведнасьці з хабараўскім пратаколам належнымі ўрадавымі органамі СССР, аддан загад аб без адкладным вызваленьні усіх арыштаваных у сувязі з канфліктам кітайскіх грамадзян інтэрніраваных кітайскіх салдат і афіцэраў.

За барацьбу супроць СССР —узнагарода Чжан-Сюэ-Ляну

ШАНХАЙ, 2. Як паведамляюць, дзяржаўны савет апублікаваў сьпіс асоб, якія атрымалі ўзнагароду ад нанкінскага ўраду з прычыны новага году. У ліку ўзнагароджаных Чжан-Сюэ-Лян, які атрымаў вышэйшую вайсковую ўзнагароду „за барацьбу супроць савецкага нападу на Манчжурыю". Атрымалі таксама ўзнагароду Вен-Ці-шан і Ван-Фу-лін.

Прыезд дэлегацыі байцоў Дал.-Усх. арміі ў Кранштадт

ЛЕНІНГРАД, 2. У Кранштадт прыбыла дэлегацыя байцоў Далёка-Ўсходняй арміі. На прыстані дэлегацыю спаткалі працоўныя Кранштадту. Дэлегаты наведалі караблі Бальтфлёту, расказаўшы чырвонафлётцам аб баявой рабоце далёкаўсходніх часьцей і чырвонафлётцаў амурскай ваеннай флётыліі.

Новы выпад ангельскіх цьвёрдалобых супроць СССР

ЛЁНДАН, 2. Корэспандэнт „Таймс" па рабочых пытаньнях азначае апублікаваньне ў першым нумары „Дэйлі Уорхэр" (штодзённы орган ангельскай компартыі) звароту прэзыдыуму Комінтэрну.

Корэспондэнт зазначае, што „Дэйлі Уорхэр" называе зварот новай магутнай зброяй у руках ангельскіх рабочых для барацьбы супроць капіталізму, рацыяналізацыі і соцыял фашыскага ўраду рабочай партыі.

„Комінтэрн—заяўляе далей корэспандэнт, зьяўляецца агэнтам савецкага ўраду". Напамінаючы, што 20-га сьнежня паміж Англіяй і СССР адбыўся абмен нотамі па пытаньню аб пропагандзе корэспандэнт піша:

„Трэба прызнаць, што прэзыдыум Комінтэрну знаходзіцца пад прамым або пасочным кантролем савецкага ураду, што апублікаваны зварот нельга разглядаць інакш, як парушэньне абавязацельстваў узятых на сябе менш двух тыдняў таму назад".

„Таймс" комэнтыруючы ў перадавой артыкул—паведамленьня свайго корэспандэнта піша:

„Ангельскаму ўраду ня прышлося доўга чакаць добрасумленнасьці савецкага ўраду па пытаньню аб пропагандзе. Пасланьне прэзыдыуму Комінтэрну зьяўляецца яркім вузорам бальшавіцкай прапаганды накіраванай галоўным чынам супроць ураду рабочай партыі і лідэраў-профсаюзаў. Гэндэрсон запэўніў, што савецкі ўрад узяў на сябе абавязак абмежаваць пропаганды Комінтэрну. Зараз чарга за Гэндэрсонам дзейнічаць і дзейнічаць з прамотою".

Усесаюзная рабочая радыё-нарада



28 сьнежнь ў калённай з-лі Дому Саюзаў у Маскве адбыўся ўсесаюзны рабочы сход, прысьвечаны вынікам 1-га зьезду ўдарных брыгад.

На здымку: Сэкратар ЦК УсеЛКСМ тав. Косараў робіць даклад.

Забастоўкі ў Лодзі і Вільні

ВАРШАВА, 1. У Лодзі і Жырардове забаставалі 5000 рабочых баваўнянай фабрыкі. Бастуючыя зьвярнуліся да ўсяго лодзінскага пролетарыяту з просьбай аб солідарным падтрыманьні іх стачкі.

У Вільні бастуюць гандлёва-прамысловыя служачыя. Дэлегаты бастуючых прыбылі ў Варшаву і зьвярнуліся да адпаведных профэсыянальных саюзаў з просьбай аб падтрыманьні. Забастоўка ў Вільні суправаджаецца сур'ёзнымі сутычкамі паміж бастуючымі і штрэйкбрэхерамі.

На пошукі амэрыканскіх лётнікаў

МАСКВА, 2. Заслужоны лётнік Громау тэрмінова рыхтуецца да ад'езду разам са сваім экіпажам у Хабараўск. Гэта другая экспэдыцыя, якая прыме ўдзел у пошуках амэрыканскіх лётнікаў.

Крызіс кітайскай контррэволюцыі

Калі на патоках рабочай крыві і на золаце імпэрыялістых вырас у 1927 годзе нанкінскі ўрад Чан-Кай-Шы—тады гоміндануаўская контррэволюцыя высунула програму аб'яднаньня краіны на буржуазна-капіталістычнай аснове

Прайшло два з лішнім гады гаспадараньня ў Кітаі гоміндануаўскай контррэволюцыі.

Крывавыя гады! Гады нястрыманага разгулу катаў, гады развалу і апусташэньня краіны, гады нячуванага ўціску яе імпэрыялістамі! У выніку развалу воднай сыстэмы, барбарскай экспл'ёатацыі сялянства і, часткова, стыхійных бядот сельская гаспадарка краіны адчувае глыбокі крызіс.

Галадае звыш 53 мільёнаў чалавек

Прамысловасьць — падае. Такія караныя галіны кітайскай прамысловасьці, як чайная, шоўкавая і табачная—у становішчы поўнага развалу. Чыгункі перапоўнены воінскімі эшалёнамі, суднаходзтва запушчана

Па афіцыйных гоміндануаўскіх вестках, у Кітаі зараз галадае звыш 53 мільёнаў чалавек, а раён голаду ахапляе звыш 1000 паветаў!

Фінансы нанкінскага ўраду ў надзвычайна цяжкім становішчы. За час свайго гаспадараньня ўраду Чан-Кай-Шы „не хапіла" даўгоў (у парадку ўнутраных пазык) звыш чым на 300 мільёнаў рублёў, а агульны доўг Кітаю па замежных і ўнутраных пазыках пераваліў за 2 з паловай мільярды рублёў.

І ня дзіўна, што спроба нанкінскага ўраду выпусьціць нядаўна новую ўнутраную пазыку на 70 мільёнаў рублёў праваліласа з трэскам. Так лопнулі, як мыльныя пузыры, дутыя бумажныя пляны „гаспадарчага пераўсьпяваньня", так абанкроцілася ўнутраная гаспадарчая політыка Нанкіну.

Моцна наступіла нага імпэрыялістых на Кітай і там варочае справамі як ёй пажадаецца.

Цяжкая прамысловасьць краіны больш чым на 50 проц. знаходзіцца ў руках замежнага капіталу. Замежныя вайсковыя караблі цэлымі флётыліямі плаваюць у кітайскіх водах.

Авантура кітайскай генэральшчыны на КУ чыгунцы канчаткова выкрылі нанкінскі ўрад, як прыслужніка імпэрыялізму! Ен давярпшыў ганебны правал замежнай політыкі Нанкіну.

Унутраная барацьба мілітарыстых разгараецца

У гэтых абставінах ня спыняюцца ўнутраныя войны кітайскіх генэральскіх клік. Спачатку (вясною 1929 году) нанкінскі ўрад Чан-Кай-шы ваяваў з так званымі гуансійскімі генэраламі (Ван-Цзун-чы, Лі-Цзун-жэнь, Лі-Ці-сін і інш.) затым Фын-Юй-сян (на паўночным заходзе Кітаю) выступіў са сваёй 25 тысячнай арміяй супроць Нанкіну, а нядаўна супроць Нанкіну выступілі генэрал Тан-Шэн-чы (у Хэнані), генэрал Шы-Ю-сан (у Пукоў, каля Нанкіну) і што асабліва важна—„левы" (а фактычна такі-ж кат генэрал—гоміндановец Чжан-Фа-гуй, аб'яднаўшыся з астаткамі гуансійцаў павёў наступленьне з правінцыі Гуансі на Гуандунь—у прыватнасьці на буйнейшы порт Поўднёва-Кантон. Хітры стары генэрал Ен-Сі-шан—губэрнатар правінцыі (Шансі) чакае „чыё возьме", каб затым далучыцца туды, дзе гэта будзе выгадней.

Унутраная вайна мілітарыстых разгараецца. Яна ахапіла амаль увесь Кітай ад Шансі і Хэнані да Гуандуня і пад шумок размоў „аб разброеньні" (нанкінскі ўрад вызначыў плян скарачэньня кітайскіх армій да 800 тысяч), пад гулы і грукат гармат і кулямётаў расьце колькасьць генэральскіх войск (яна пераваліла за 2 з паловай мільёны), утрыманьне якіх кладзецца на плечы замучаных, галодных, ажабрачаных мас.

Надыходзяць чырвоныя дні

Узброеная барацьба паміж генэральскімі клікамі паглыбляе эканамічны крызіс. Расьце нездаволеньне ў гушчы мільёнаў працоўных. Сілы рэволюцыі зьбіраюцца і мацнеюць. У Шанхаі, дзе ў мінулым годзе баставалі дзесяткі рабочых, дзе стачкі з эканамічных перарастаюць у політычныя, лік членаў чырвоных профсаюзаў дасягае 10 тысяч, у Гонконгу,—звыш 5 тысяч.

У Кантоне дзе выразалі шмат соцен рэволюцыйных рабочых, дзе з часу паўстаньня 1927 году, 5 разоў правальваліся і былі зьнішчаны партыйныя комітэты—у гэтым першым горадзе саветаў, у дзень сёмага лістападу 29 году—пролетарыят у працягу некалькіх гадзін змагаўся з гоміндануаўскай паліцэйшчынай і войскам.

Рэволюцыйны Кантон жыве! Кантонскія пролетары ізноў змагаліся як чэрці на барыкадах Кастрычніка!

Гэроічны партызанскі рух эксплёатуемага сялянства на поўдні і ў цэнтры Кітаю ахапляе раёны з насельніцтвам да 60 мільёнаў чалавеч.

Чырвоныя партызанскія часьці пад кіраўніцтвам Чу-Тэ, Мао-Цзэ-дуня, Фын-Чжы-ліна, Пен-Тэ-хуая і іншых у правінцыях Хэнані, Цзянсі, Шандуні і Фуцзян налічвае да 20 тысяч штыхоў. Яны перакідваюцца з павету ў павет, насаджаючы савецкія ачагі, зьнішчаючы паноў і растаўшчыкоў, нясучы на сьцягах сваіх агнявыя заклікі да аграрнай рэволюцыі, спальваючы панскія маёнткі і кабальныя дагаворы.

На чале рэволюцыйных мас ідзе гэроічная кітайская компартыя. Яна ўзмацняе свае шэрагі ў гушчы мас, у барацьбе з гоміндануаўскімі катамі, у выжыцьці ўхілаў ва ўласных шэрагах.

У Кітаі нарастае новая рэволюцыйная хваля, паскараецца рэволюцыйны выбух, надыходзяць чырвоныя дні.

Компартыя рыхтуецца да гэтых новых боек.

ТРОХМІЛЬЕННЫ УКЛАД У ЭКСПАРТНЫ ФОНД ДЗЯРЖАВЫ

Беларусь павінна сабраць уціль-сыравіны ня менш, чым на 3 мільёны рублёў

Камітэты і ячэйкі, дайце лепшыя сілы на працу па загатоўцы другараднай сыравіны

Да рэчаў другараднага экспорту адносяцца: футра і мехсыравіна (ліса, воўк, сабака, кошка, вавёрка і інш.) скурсыравіна (скура коняй, кароў і г. д.) шчаціна, конскі волас, пух, пяро, шэрсьць, таплёнае кароўе масла, сьлівачнае масла, казінае малако, яйкі, куры, гусі, дзіч, кішкі пенька-кароткае валакно, маславое насеньне, рызьзё, косьці, мукулатура (папяровыя адкіды), фрукты сьвежыя, сушоныя ягады, грыбы, цыбуля травяное насеньне, адкіды прамтавараў (шквар) і інш. Усё пералічанае прымаецца загатоўчымі пунктамі Дзяржгандлю, якія маюцца ў кожным раёнэ, а ў раёнах, дзе няма пунктаў, прымаюцца агэнтамі Наркамгандлю.

Высокія тэмпы індустрыялізацыі прамысловасьці і сельскай гаспадаркі Савецкага Саюзу патрабуюць значнага павялічэньня імпорту (завозу з-за мяжы) машын. Забясьпечыўшы калгас патрэбнай колькасьцю сталых коняй—трактараў, мы зможам з посьпехам і ў самы кароткі тэрмін перабудаваць сельскую гаспадарку. Для калгасаў патрэбна завесьці з-за мяжы тысячы трактароў, а гэта магчыма зрабіць толькі павялічыўшы наш экспорт (вываз за мяжу).

Вось чаму справа загатовак другарадных відаў сыравіны набыла цяпер гэткае важнае значэньне. Нам, вядома, лягчэй экспартаваць розныя адкіды прамысловасьці і сельскай гаспадаркі, якія нашай гаспадарцы мала патрэбны, а за мяжой вельмі цэняцца. Такія адкіды, як рызьзё, косьці, кішкі, шчаціна, кароўі і конскі волас, папяровая макулатура, старыя жасьцяныя коркі, рагі, капыты і інш. за мяжой патрабуюць у вялікай колькасьці, у нас-жа яны яшчэ ў большай частцы закапваюцца ў зямлю ці паляцца.

Наша прамысловасьць таксама павялічвае попыт на паказаныя віды сырцу і выробляе з іх вельмі патрэбныя рэчы: паперу, шэрсьцяныя тканіны, розную галянтарэю, клей і інш.

ПАД НАГАМІ У НАС МІЛЬЁНЫ

Пры палепшаньні работы загатоўчага апарату дзяржгандлю і кооперацыі, які па гэтай справе кульгае на усе чатыры нагі, і пры мобілізацыі ўвагі партыйнай, савецкай грамадзкасьці, мы зьбіраючы непатрэбныя адкіды ў заводах, фабрыках, хатах і сельскіх гаспадарках, можам значна павялічыць экспорт, а, значыць і павялічыць імпорт машын.

У „Чырвонай Зьмене“ ўжо прыводзіліся лічбы сыравіны, якую яшчэ ніхто не загатовіў („Чырвоная Зьмена“ № 149 ад 4 ліпеня 1929 г.). Комсамольскія ячэйкі і раёны яшчэ не разварушыліся і вельмі мала зрабілі каб захаваць мільёны рублёў, што гінуць пад нагамі.

Ячэйкі гораду і вёскі не займаюцца яшчэ пытаньнямі павялічэньня экспорту. У друку мы мелі толькі пару фактаў конкрэтных спраў. Больш працы правялі піонэрскія атрады, якія абыходзяць установы і асобныя хаты ў гарадох і зьбіраюць папяровую макулатуру, рызьзё, мэталёвы лом і інш.

Тут поле работы надта шырокае, як для ячэек гарадзкіх, так і асабліва вясковых.

У кожным прадпрыемстве можна наглядаць, як затаптваюць і спальваюць прамасьленыя канцы, паперу, дробныя кавалкі бляхі і нават каляровых мэталяў (медзь, цынк, баббіт і інш.). Комсамольская ячэйка можа дабіцца таго, каб усё гэта зьбіралася ў скрынках для адкідаў і здавалася дзяржгандлю.

У кожным жакце ці комунальным доме жывуць комсамольцы і піонэры. На іх ляжыць абавязак растлумачыць жыльцам карысьць захаваньня адкідаў; касьцей, разьзя, коркі, фальга ад бутэляк, бляшанкі, шкло, розная папера, часткі мэталёвых рэчаў і інш. Патрэбна дабіцца, каб у кожным буйным доме былі скрынкі падзелены на дзьве часткі: адна частка для попелу, а другая для ўсіх астатніх каштоўных адкідаў. Гэта ня брудная справа, а конкрэтны ўдзел комсамольцаў і піонэраў у соцыялістычным будаўніцтве.

У кожнай вёсцы ёсьць група комсамольцаў, якія разам з загатаўцамі (кооперататары, дзяржгандаль) павінна організаваць збор ададкідаў: рызьзё, косьці, рагі, капыты, шчаціну, волас, кішкі (асабліва авечыя) і інш. Справа гэта не такая ўжо цяжкая, калі за яе ўзяцца. Трэба на сходах і ў хатах-чытальнях растлумачыць важнасьць захаваньня адкідаў і здачы іх кооперацыі ці Дзяржгандлю. Трэба разам з загатаўцамі абыходзіць кожную хату і перакапаць кожную гаспадыню ў неабходнасьці збору і здачы паказанай сыравіны.

ПРЫКЛАДЫ ДОБРАЙ РАБОТЫ

„Атрад комсамольцаў з беднякоў і серадпякоў вёсак Касьцюковіцкага раёну прывёз з мястэчка рызьзё, косьці, грыбы, капыты і інш. Замест сырцу атрымалі розную галянтарэю“ („Зьвязда“ ад 6-ХІІ 29 г.)

«Языльская ячэйка... абгаварыла пытаньне аб загатоўцы сыравіны. Сход вылучыў комсамольца Целяша, які... ужо сабраў 135 пудоў рознай сыравіны. Тав. Целяш за праведзеную працу атрымаў 30 р. камісійных, на якія купіў пазыку» („Чырв. Зьмена“ ад 24-ХІ 1929 г.).

За паказальную работу другараднай сыравіны Наркамгандаль у бліжэйшы час прэміруе некаторыя ячэйкі вэлёсыпэдамі.

Дзяржгандаль і кооперацыя праводзяць загатоўку другарадных відаў яшчэ больш праз прыватнага зборшчыка—прасола. Прасол, амаль што заўсёды ашуквае сялянку, даючы ёй за пуд рызьзя, які каштуе 1 р. 36 к. усяго адну хустку коштам у 36 капеек. Загатаўцы павінны замяніць прасолаў чырвонымі карабейнікамі з парабкоў і беднякоў - комсамольцаў. Кожная ячэйка павінна вылучыць такіх комсамольцаў.

Вось конкрэтныя справы ў праводзеньні соцспаборніцтва паміж ячэйкамі. Групы комсамольцаў і актыўнай беспартыйнай моладзі кожнай вёскі павінны быць абвешчаны ўдарнымі брыгадамі па праводзеньню загатовак другарадных відаў.

Асабліва важна работа колгасных ячэек. Ніводная ануча ці костка, ніводны комплект кішак не павінны загінуць у колгасе. Трэба памятаць, што ўсе сродкі ад рэалізацыі за мяжой адкідаў, сабраных колгасамі, па пастанове Совнаркому, ідуць на дадатковы завоз трактараў колгасам. Калі ў спаборніцтва будзе уцягнута ўся бядняцка-серадняцкая вёска,—мы атрымаем дадатковыя міліёны рублёў на далейшае палепшаньне сельскай гаспадаркі.

Важна работа школ. Кожная школа гораду і вёскі можа сабраць шмат рызьзя, касьцей, папяровай макулатуры і інш. Кожны скарыстаны сшытак павінен быць здадзены на пераработку. За гэта школы прэміруюцца чыстымі сшыткамі.

Комсамол можа і павінен многа зрабіць для павялічэньня экспорту і для большага паскарэньня соцыялістычнага будаўніцтва.

К. Верамейчык.

АДМІНІСТРАЦЫЯ ПЕРАШКАДЖАЕ

На шорнай фабрыцы (Менск) нічога ня зроблена па збору ўцілю, ня гледзячы на тое, што там маецца другарадная сыравіна.

З боку аднаго рабочага была прапанова, каб організаваць брыгады па збору адкідаў і зрабіць для гэтай мэты скрыню, дык адміністрацыя ад гэтага адмовілася. Яна абапіраецца на тое, што яшчэ няма дырэктыў зьверху. Частка адкідаў сабраныя на шорнай фабрыцы могуць быць перададзены гарбарні „Бальшавік“, чкая-б скарыстала іх для вырабу падноскаў.

Трэба адзначыць, што ні партыйная ні комсамольская ячэйкі нічога ня робяць, па разгортваньні працы збору другараднай сыравіны.

Л. Фрыд.

Прамова тав. Сталіна на усесаюзнай конфэрэнцыі аграрнікаў-марксыстых

(Працяг. Пачатак гл. у №№: 969, 970)

Кастрычнікавая рэвалюцыя зьнішчыла прыватную ўласнасьць на зямлю, зьнішчыла куплю-продаж зямлі, устанавіла нацыяналізацыю зямлі. Што гэта значыць? Гэта значыць, што селянін, каб вырабіць хлеб, зусім не адчувае патрэбы ў тым, каб купляць зямлю. Раней ён гадамі накапляў сродкі для таго, каб набыць зямлю, улазіў у даўгі, ішоў у кабалу толькі для таго, каб набыць зямлю. Выдаткі на куплю зямлі, зразумела, клаліся на кошт вытворчасьці хлеба. Цяпер селянін у гэтым не адчувае патрэбы. Цяпер ён можа вырабляць хлеб, ня купляючы зямлі. Што-ж, гэта палягчае сялянам, або не палягчае? Ясна, што палягчае. Далей.

Да апошняга часу селянін вымушаны быў длубаць зямлю старым інвэнтаром у парадку індывідуальнае працы. Усякаму вядома, што індывідуальная праца, узброеная старымі, цяпер ужо ніздатнымі прыладамі вытворчасьці, не дае таго выйгрышу, які патрэбен для таго, каб жыць някепска, сыстэматычна падымаць сваё матар'яльнае становішча, разьвіць сваю культуру і выйсьці на шырокую дарогу соцыялістычнага будаўніцтва. Цяпер пасьля ўзмоцненага разьвіцьця колгаснага руху сяляне маюць магчымасьць аб'яднаць сваю працу з працай сваіх суседзяў, аб'яднацца ў колгас, разьбіць цаліну, скарыстаць пакінутую зямлю, атрымаць машыну, трактар, узьняць, такім чынам, продукцыйнасьць сваё працы у два разы, калі ня ў тры. Што гэта значыць? Гэта значыць, што селянін мае цяпер магчымасьць, дзякуючы аб'яднаньню ў колгасы, вырабляць значна больш, чым раней пры тэй-жа траце працы. Гэта значыць, што вытворчасьць хлеба можа стаць на многа таннейшай, чым гэта мела месца да апошняга часу. Гэта значыць, нарэшце, што пры стабільнасьці цэн, селянін можа атрымаць за хлеб значна больш, чым ён атрымліваў да гэтага часу.

Як можна пасьля гэтага сьцьвярджаць, што Кастрычнікавая рэволюцыя не дала выйгрышу сялянству? Хіба ня ясна, што людзі, якія гавораць такую недарэчнасьць, яўным чынам робяць паклёп на партыю і савецкую ўладу? Але што з гэтага вынікае? З гэтага вынікае, што пытаньне аб „нажніцах“—пытаньне ліквідацыі „нажніц“ павінна быць пастаўлена цяпер панованаму. З гэтага вынікае, што калі колгасны рух будзе расьці цяперашнім тэмпам, „нажніцы“ будуць зьнішчаны ў бліжэйшы час.

З гэтага вынікае, што пытаньне аб адносінах паміж горадам і вёскаю становіцца на новую глебу, што супроцьлегласьць паміж горадам і вёскаю будзе размывацца паскораным тэмпам. Гэта акалічнасьць мае, таварышы, вялізарнае значэньне для ўсяго нашага будаўніцтва. Яна ператварае псыхалёгію селяніна, паварочвае яго тварам да гораду. Яна стварае глебу для зьнішчэньня процілегласьці паміж горадам і вёскаю. Яна стварае глебу для таго, каб лёзунг партыі „тварам да вёскі“ дапаўняўся лёзунгам сялян - колгасьнікаў „тварам да гораду“. І ў гэтым няма нічога дзіўнага, бо селянін атрымлівае зараз ад гораду машыну, трактар, агранома, організатара, нарэшце, простую дапамогу ў барацьбе за перамогу над кулацтвам. Селянін старога тыпу з яго зьверскім недавер'ем да гораду, як грабіцеля, адыходзіць на задні плян. Яго зьмяняе новы селянін, селянін-колгасьнік, які глядзіць на горад з надзеяй. На зьмену селяніну старога тыпу, які баіцца спусьціцца да беднаты і толькі ўкрадкам падымаецца да палажэньня кулака (могуць пазбавіць **выбарчага права**) **прыходзіць** новы селянін, які мае новую пэрспэктыву—пайсьці ў колгасы, выбрацца з галечы. Вось як абарачаецца справа, таварышы. Тым больш прыкра, таварышы, што нашыя тэарэтыкі-аграрнікі ня прынялі ўсіх мер да таго, каб выкрыць і вырваць з карэньнямі ўсе і ўсялякія буржуазныя тэорыі, якія прабуюць разьвянчаць заваёвы Кастрычнікавай рэвалюцыі.

АБ ПРЫРОДЗЕ КОЛГАСАЎ

Колгасы, як тып гаспадаркі, ёсьць адна форма соцыялістычнае гаспадаркі. У гэтым ня можа быць ніякага сумненьня. Адзін з прамоўцаў выступаў тут і разьвенчваў колгасы. Ён запэўняў, што колгасы, як гаспадарчая організацыя, ня маюць нічога супольнага з соцыялістычнай формай гаспадаркі.

Я павінен заявіць, таварышы, што такая характарыстыка колгасаў зусім няправільная. Ня можа быць сумненьняў, што яна, гэтая характарыстыка, нічога ня мае супольнага з ленінізмам. Чым вызначаецца тып гаспадаркі? Відавочна адносінамі людзей у працэсе вытворчасьці. Чым-жа іншым можна вызначыць тып гаспадаркі? Але хіба-ж у колгасе маецца кляса людзей, якія зьяўляюцца ўласьнікамі сродкаў вытворчасьці і кляса людзей, якія пазбаўлены гэтых сродкаў вытворчасьці? Хіба-ж у колгасе маецца кляса эксплёататара і кляса эксплёатуемых? Хіба колгас не прадстаўляе аграмаджаньня асноўных прылад вытворчасьці на зямлю, якая належыць тэй-жа дзяржаве? Якая ёсьць падстава сьцьвярджаць, што колгасы, як тып гаспадаркі, не прадстаўляюць аднае з форм соцыялістычнае гаспадаркі? Зразумела, у колгасах маюцца супярэчнасьці. Зразумела, у колгасах маюцца індывідуалістычныя і нават кулацкія перажыткі, якія яшчэ ня зьніклі, але якія абавязкова павінны адпасьці з прагам часу па меры ўмацаваньня колгасаў, па меры іх машынізацыі. Але ці можна адмаўляць, што колгасы, узятыя цалкам з іх супярэчнасьцямі і недастаткамі, колгасы, як гаспадарчы факт, прадстаўляюць у асноўным новы шлях разьвіцьці вёскі, шлях соцыялістычнага разьвіцьця вёскі, процілегласьць кулацкаму капіталістычнаму шляху разьвіцьця? Хіба можна адмаўляць, што колгасы (я кажу аб колгасах, а не аб ілжэколгасах) прадстаўляюць у нашых умовах базу і ачаг соцыялістычнага будаўніцтва ў вёсцы, якая вырасла ў гострых сутычках з капіталістычнымі элемэнтамі? Хіба ня ясна, што спробы некаторых таварышоў разьвянчаць колгасы, абвясьціць іх буржуазнай формай гаспадаркі, ня маюць пад сабою ніякіх падстаў? У 1923 годзе ў нас ня было яшчэ масавага колгаснага руху. Ленін у сваёй брашуры „Аб каапэрацыі“ меў на ўвазе ўсе віды каапэрацыі і ніжэйшыя яе формы (забясьпячальныя і збытавыя) і вышэйшыя (калгасная форма). Што-ж гаварыў ён тады аб коопэрацыі, аб коопэрацыйных прадпрыёмствах? Вось адна цытата з брашуры Леніна „Аб коопэрацыі“.

„Пры нашым існуючым ладзе коопэрацыйныя прадпрыемствы адрозьніваюцца ад прыватна-капіталістычных, як прадпрыёмствы колектыўныя, але не адрозьніваюцца ад прадпрыёмстваў соцыялістычных, калі яны абаснаваны на зямлі пры сродках вытворчасьці, якія належаць дзяржаве, г. зн. рабочай клясе“.

Значыць Ленін бярэ коопэрацыйныя прадпрыемствы не самі па сабе, а ў сувязі з нашым існуючым ладам, у сувязі з тым, што яны функцыянуюць на зямлі, якая належыць дзяржаве, краю, дзе сродкі вытворчасьці належаць дзяржаве, і, разглядаючы іх у такім парадку, Ленін сьцьвярджае, што коопэрацыйныя прадпрыёмствы не адрозьніваюцца ад прадпрыёмстваў соцыялістычных. Так гаворыць Ленін аб коопэрацыйных прадпрыёмствах наогул. Хіба-ж не зразумела, што з тым большай падставай можна сказаць тое-ж самае аб колгасах нашага пэрыяду?

Гэтым, між іншым, тлумачыцца, што Ленін лічыць „просты рост коопэрацыі“, пры нашых умовах „тожсамым з ростам соцыялізму“. Вы бачыце, што разьвенчваючы колгасы, вышэйназваны прамоўца дапусьціў грубейшую памылку супроць ленінізму. З гэтае памылкі вынікае другая яго памылка, адносна клясавае барацьбы ў колгасах. Прамоўца так выразна расьпісаў клясавую барацьбу ў колгасах, што можна падумаць, што клясавая барацьба ў колгасах не адрозьніваецца ад клясавай барацьбы па-за колгасамі. Больш таго, можна падумаць, што яна становіцца там яшчэ больш жорсткай. Між іншым, не адзін толькі названы вышэй прамоўца вінаваты ў гэтай справе. Балбатня аб клясавай барацьбе, піск і візг адносна клясавае барацьбы ў колгасах прадстаўляе цяпер характэрную рысу ўсіх нашых „левых“ крыкуноў. Пры чым найбольш камічным у гэтым піску зьяўляецца тое, што піскуны гэтыя „бачаць“ клясавую барацьбу там, дзе яе няма, або амаль няма, але ня бачаць яе там, дзе яна існуе, дзе яна пераліваецца праз край. Ці ёсьць элемэнты клясавай барацьбы ў колгасах? Так ёсьць. Ня можа ня быць элемэнтаў клясавай барацьбы, калі там захоўваюцца яшчэ перажыткі індывідуалістычнай і нават кулацкая псыхалёгіі, калі там маецца яшчэ некаторая нироўнасьць. Ці можна сказаць, што клясавая барацьба ў колгасах роўназначна клясавай барацьбе па-за колгасамі? Не, нельга. У тым-та і заключаецца памылка нашых „левых“ фразёраў, што яны ня бачаць гэтае розьніцы. Што значыць, клясавая барацьба па-за колгасамі да ўтварэньня колгасаў? Гэта значыць барацьба з кулаком, які ўладае прыладамі, сродкамі вытворчасьці, які закабаляе сабе беднату пры дапамозе гэтых прыладаў сродкаў вытворчасьці. Гэтая барацьба зьяўляецца барацьбою не на жыцьцё, а на сьмерць.

Працяг на 3 староцы

Кожную вольную капейку на індустрыялізацыю

КОМСАМОЛ МЕНСКУ ОРГАНІЗУЕ КОМСАМОЛЬСКУЮ АШЧЭДКАСУ. КОЖНЫ КОМСАМОЛЕЦ ПАВІНЕН БЫЦЬ УКЛАДЧЫКАМ КАСЫ

Мобілізацыя вольных сродкаў ідзе нездавальняюча

„Адзначаючы некаторае палепшаньне працы па ўцягненьню зьберажэньняў насельніцтва ў ашчадныя касы і павялічэньні ўкладчыкаў, усё-ж праца па мобілізацыі сродкаў насельніцтва, асабліва на вёсцы, праводзіцца **НЕЗДАВАЛЬНЯЮЧА** *і адстае ад маючыхся магчымасьцяў і запатрабаваньняў у сувязі са шпаркім тэмпам соцыялістычнага будаўніцтва.*

Зусім не прыстасавана сетка ашчадных кас да ахопу і абслугоўваньня колгасаў і саўгасаў, нездавальняюча організавана популярызацыя і растлумачэньне задач ашчаднай справы сярод насельніцтва, колгасаў, саўгасаў і бядняцка-серадняцкіх мас вёскі; ня створан актыў, праз які ашчадныя касы маглі-б узьдзейнічаць на прыток сродкаў працоўных, асабліва ў вёсцы".

(З пастановы сэкратарыяту ЦК КП(б)Б).

Зьбярэм усе вольныя сродкі

Праца па мобілізацыі сродкаў насельніцтва на патрэбы соцыялістычнага будаўніцтва зьяўляецца аднэй з важнейшых задач. Ашчадная справа набывае зараз ва ўмовах напружанасьці фінансавага пляну вялікае значэньне. Аднак, калі мы прыгледзімся да вынікаў працы ашчадных кас БССР, якія маюць досыць вялікую сетку (каля 600 кас), дык напрашваецца вывад, што дырэктыва ЦК КП(б)Б зусім млява выконваецца.

У пастанове ЦК гаворыцца: „ШТО ПРАЦА ПА МОБІЛІЗАЦЫІ АШЧАДКАСАМІ СРОДКАЎ НАСЕЛЬНІЦТВА, АСАБЛІВА НА ВЁСЦЫ ПРАВОДЗІЦЦА НЕЗДАВАЛЬНЯЮЧА І АДСТАЕ АД МАГЧЫМАСЬЦЯЙ І ПАТРАБАВАНЬНЯЎ СОЦЫЯЛІСТЫЧНАГА БУДАЎНІЦТВА.

Вось некаторыя лічбы, якія характарызуюць становішча ашчадпрацы ў БССР.

Кантрольн я лічбы на 1928-29 г. па ўцягненьню ўкладаў фізычных асоб выкананы толькі на 94 проц., у той час, калі амаль па ўсіх галіках народнай гаспадаркі ў 28 29 гаспадарчым годзе кантрольныя лічбы выкананы З ПЕРАВЫШЭНЬНЕМ.

50 і 7 проц.

Да гэтага часу ашчадкасамі ахоплена толькі каля 50 проц. сяброў профсаюзаў, а ахоп сялянства складае каля 7 проц.

Група наёмнай працы мае ва ўкладах толькі каля 2 проц. у адносіне прыбыткаў гэтай групы, уклады сялянства ў параўнаньні з прыбыткамі ад сельскай гаспадаркі і неземляробчых прыбыткаў складаюць толькі 0,80 проц. Ня лепш справа разгортваецца і ў першым квартале бягучага гаспадарчага году. Згодна заданьняў у першым квартале павінна быць уцягнута каля 600 тысяч рублёў сялянскіх укладаў, а сапраўды на 20-XII—29 г. ВЫКАНАНА ПАЛОВА ЗАДАНЬНЯ.

Тлумачыцца гэта тым, што самі ашчадкасы і іх апарат не організаваў як сьлед сваю працу. Ён застыў на старых формах і мэтадах работы. Не дасягнуў таго тэмпу, які нам патрэбен зараз. Ашчадная справа не ахапіла шырока савецкую грамадзкасьць.

Выканаць 80 проц. гадавога заданьня

Зараз перад апаратам ашчадных кас пастаўлены шэраг адказьнейшых задач. УЛІЧВАЮЧЫ НЕЗДАВАЛЬНЯЮЧАЕ ВЫКАНАНЬНЕ ЗАДАНЬНЯ Ў ПЕРШЫМ КВАРТАЛЕ АШКАДКАСЫ ПАВІННЫ ДАБІЦЦА ВЫКАНАНЬНЯ Ў ДРУГІМ КВАРТАЛЕ БЯГУЧАГА ГОДУ НА 80 ПРОЦ. ГАДАВЫХ КАНТРОЛЬНЫХ ЛІЧБАЎ ПА СЯЛЯНСКАМУ СЭКТАРУ. Актывізаваць свой апарат, перавесьці ўсю працу на новыя формы і мэтады, прыстасаваць усю сетку кас да абслугоўваньня соцыялістычнага сэктару на вёсцы шляхам організацыі кас пры буйных саўгасах і колгасах; стварыць навокал ашчаднай справы сталы актыў з ліку рабочых, работніц, батрацтва і колгасьнікаў, організаваўшы ўвагу і актыўнасьць мас на аказаньне практычнай дапамогі ў рабоце ашчадным касам.

Зразумела, што аднаму апарату кас без дапамогі ўсіх органаў і грамадзкасьці з гэтымі задачамі НЯ СПРАВІЦЦА. Партыйным, савецкім, прафэсыянальным органам і комсамолу ТРЭБА НЕАДКЛАДНА УЗЯЦЦА ЗА ВЫКАНАНЬНЕ ДЫРЭКТЫВЫ ЦК КП(б)Б аб узмацненьні работы вакол пытаньня мобілізацыі свабодных сродкаў насельніцтва на СПРАВУ СОЦБУДАЎНІЦТВА. ПАТРЭБНА ЗАВАСТРЫЦЬ УВАГУ ЎСЁЙ МАСЫ КОМСАМОЛЬЦАЎ, РАБОЧАЙ МОЛАДЗІ БАТРАЦТВА КОЛГАСЬНІКАЎ І САЎГАСЬНІКАЎ НА ГЭТЫМ ПЫТАНЬНІ. Безадкладна прыступіць да практычнай работы па вярбоўцы новых укладчыкаў. Неабходна стварыць комсамольскія брыгады для сувязі з ашчэдкасамі. Групы „лёгкай кавалерыі" павінны ўзяць на сябе абавязак правяраць працу апаратаў ашчэдных кас.

Больш увагі і адказнасьці за выкананьне заданьняў па мобілізацыі зьберажэньняў. Ашчэдную справу на рэйкі сацыялістычнага спаборніцтва.

ПАДОЛЬСКІ.

„З НОВЫМ ГОДАМ"...

(Налёт „лёгкай кавалерыі" на ашчэдкасы гораду Менску)

Як працуюць ашчэдныя касы Менску, ці падрыхтаваны яны да выкананьня задач, ускладзеных па іх партыяй і ўрадам, як пастаўлена праца па абслугоўваньню працоўных!—вось пытаньні, якія паставілі перад сабой „лёгкія кавалерыстыя" заводу „Бальшавік" і ячэйкі банкаўскіх устаноў, організуючы налёт на ашчэдчыя касы Менску.

31-га сьнежня сабраліся 30 „кавалерыстых" распрацавалі плян налёту, падзялілі ролі, а на заўтра —1-га студзеня 1930 году, а 8-й гадзіне раніцы разышліся па 6 ашчэдкасах гораду.

Позьняцца на працу

Звычайнае зьявішча сярод працаўнікоў акруговай касы. У дзень налёту ад 3 да 15 хвілін спазьнілася 7 супрацоўнікаў. Наведвальнікі ўжо чакалі каля зачыненых ваконцаў, а працаўнікі павольна, па адным прыходзілі на працу. Табель з нумарамі для рэгістрацыі прыходу і ўходу служачых не ў пашане працаўнікоў акруговай касы. Адзін нумар вешае, другі—не, за гэтым ніхто ня сочыць.

Кваліфікацыя працаўнікоў амаль ва ўсіх касах нездавальняючая. Опэрацыі, што вытваралі „лёгкія кавалерыстыя" падцьвердзілі гэта.



„Налётчыкі" каля ваконца касіра акруговай касы.

У другім аддзяленьні пры Дзяржбанку кантралёр—тав. Дубравенская выдала „кавалерыстаму" 71 руб. і адчыніла бягучы рахунак па прад'яўніка, ня маючы на гэта ніякіх падстаў. Характэрна, што і намесьнік кіраўніка Дзяржбанку тав. Нісельсон таксама ня мог, як сьлед растлумачыць памылковасьць гэтых опэрацый.

У 17 касе МББ чыгункі супрацоўнік Мялешка прыняў перавод на прад'яўніка, чаго рабіць ні ў якім разе нельга.

ШТО ТАКОЕ СЭРТЫФІКАТЫ?

На гэтае пытаньне ніводны скарбнік ня мог даць сталага адказу.

Трэцяе аддзяленьне пры паштова-тэлеграфнай канторы наогул адмовілася адказаць на гэтае пытаньне, адаслаўшы „кавалерыстага" у акруговую касу.

Абавязак кожнага працаўніка ашчадкасы растлумачыць наведвальніку, калі апошні прадае аблігацыі дзяржаўных пазык, неабходнасьць здачы на захаваньне і стала праверыць ці выйграла аблігацыя і толькі пасьля гэтага купляць аблігацыю, чаго ні ў воднай касе не наглядаецца. Працаўнікі адносяцца да сваёй работы казённа, асабліва працаўнікі з фондавай часткі акруговай ашчэдкасы.



Кантралёр тав. Дубравенская выдала 71 рубель грошай з ашчадкасы пры Дзяржбанку „кавалерыстаму" біз усякіх падстаў.

АДНОСІНЫ ДА НАВЕДВАЛЬНІКАЎ

прымушаюць жадаць лепшага. Даведкі даюцца недастаткова абгрунтаваныя. Адчуваецца жаданьне адчапіцца ад надаедлівага наведвальніка. Знаёмы таго ці іншага працаўніка сустракае ўважлівасьць і хуткасьць выкананьня опэрацыі і зусім другое з незнаёмымі.

Скарбнік Дзёмін у той час, калі ля вакна стаяла чарга, спакойна гутарыў з сваімі супрацоўнікамі. Час прыёму наведвальнікаў загадчыкам касы невядомы.

Ашчэдкаса... дзе яна?

На заводзе „Дрэваапрацовачнік" маецца ашчэдная каса. Шыльда касы прыбіта да дзьвярэй нейкага хляве. Знайсьці касу надта цяжка. Фабком працай касы не займаецца. Старшыня фабкому ня мог налётчыкам адказаць, якія заданьні мае іх каса, ня гледзячы на тое, што па яго словах гэтае пытаньне стаялана паседжаньні завкому.

Агітацыйна пропагандысцкая работа ва ўсіх касах праводзіцца слаба. Касы не зьвязаны з прадпрыемствамі, якія знаходзяцца ў раёне кас, адчуваецца недахват плякатаў і агітлітаратуры.

„Кавалерыстыя" з заводу „Бальшавік" і банкаўскіх устаноў.

ПАДТРЫМАЦЬ ПАЧЫН

Комсамольская ячэйка банкаўскіх устаноў правільна зразумела дырэктыву апошняга пленуму ЦК УсеЛКСМ, які запісаў: **„Удзел у гаспадарчым будаўніцтве—галоўная задача комсамольскай організацыі"**. Яна, наперакор шэрагу савецкіх ячэяк, якія усё яшчэ лічаць, што іх удзел у гаспадарчым будаўніцтве, як ячэяк савецкіх **не абавязковы** (!?) і што яго няма ў чым выявіць, узяліся за паладжваньне працы ашчадных кас і першыя праявілі ініцыятыву ў організацыі комсамольскага аддзяленьня ашчаднай касы на Ляхаўцы.

Вось, што пішуць яны ў сваёй рэзолюцыі па гэтым пытаньні.

Бюро ячэйкі, абмеркаваўшы пытаньне аб удзеле ячэйкі ў разгортваньні працы на ўцягненьню новых укладчыкаў і ўкладаў, палепшаньню якасьці працы ашчэдкас лічыць неабходным правесьці:

1. З мэтаю падвышэньня якаснай працы ашчэдапарату, адчыніць у рабочым раёне Ляхаўкі комсамольскае аддзяленьня ашчэдкасы, якое сваім прыкладам павінна будзе паказаць, як трэба працаваць.

2. Для забесьпячэньня аддзяленьня працаўнікамі, прасіць колектыў КСМ заводу „Бальшавік" вылучыць на пасаду загадчыка касы адпаведнага комсамольца.

3. Для ўцягненьня ў актыўную працу па разгортваньню ашчэдсправы ў горадзе, дагаварыцца з колектывам „Бальшавік" аб прыняцьці шэфства над комсамольскім аддзяленьнем, вылучыўшы з комсамольцаў брыгаду для прымацаваньня да буйных прадпрыемстваў Ляхаўкі з мэтаю популярызацыі ашчадных кас. У кожную брыгаду вылучыць комсамольцаў банкаўскай ячэйкі.

4. Правесьці налёт атрадаў „лёгкай кавалерыі" банкаўскіх устаноў і „Бальшавіка" на ашчадныя касы Менску з мэтаю выяўленьня іх работы.

5. Усім сябрам ячэйкі да 5-га студзеня 1930 году ўступіць укладчыкамі ў ашчадкасы і завербаваць кожнаму ня менш 3-х укладчыкаў. Для выкананьня гэтага мерапрыемства выклікаць на соцспаборніцтва колектыў „Бальшавіка".

6. П асіць райком комсамолу прапанаваць усім ячэйкам чарговы саюзны дзень, прысьвяціць пытаньню ўдзелу моладзі ў ашчадсправе. Банкаўскай ячэйцы забясьпечыць гэтыя сходы дакладчыкамі, з цягам часу якіх організаваць ў сталую групу агітатараў за ашчадсправу.

7. У бліжэйшы час наладзіць агульна-гарадзкі вечар з колектывам „Бальшавіка", прысьвечаны ўдзелу комсамолу ў ашчаднай справе.

8. Усю працу ў гэтым напрамку высьвятляць на старонках „Чырвонай Зьмены" і іншых газэт.

Прапановы комсамольцаў банкаўскіх устаноў падтрыманы колектывам заводу „Бальшавік" і адобраны Менскім акругкомам комсамолу. Гэтымі днямі комсамольскае аддзяленьне ашчаднай касы пачне працаваць. Комсамольцы „Бальшавіка" ужо вылучылі на пасаду загадчыка т. **Эйдзінава**. Пачын ячэйкі банкаўскіх устаноў апраўдае сябе толькі тады, калі ўся організацыя кожная ячэйка паасобку будзе пільна сачыць і дапамагаць у працы комсамольскага аддзяленьня ашчаднай касы.

Заданьне аб уступленьні ў ашчадкасу кожнага комсамольца гэтай ячэйкі трэба распаўсюдзіць на ўсе ячэйкі цалкам.

„Неабходна, каб лішкі накапленьня ў краіне не распыляліся, а зьбіраліся ў нашых крэдытных установах. Нельга сказаць, каб у гэтай галіне справа абстаяла ў нас колькі-небудзь здавальняюча... Мы павінны вырашыць гэтую задачу як-бы там ня было".

И. Сталин

Прамова тав. Сталіна на ўсесаюзнай конфэрэнцыі аграрнікаў марксыстых

(Працяг)

А што значыць клясавая барацьба на базе колгасаў? Гэта значыць перш за ўсё, што кулак разьбіты, пазбаўлены прылад сродкаў вытворчасьці. Гэта значыць падругое што беднякі, серадняк аб'яднаны колгасы на базе аграмаджаньня асноўных прылад сродкаў вытворчасьці. Гэта значыць нарэшце, што справа ідзе аб барацьбе паміж членамі колгасаў з якіх адны ня вызваляліся яшчэ ад індывідуальных кулацкіх пэражыткаў і прабуюць скарыстаць некаторую няроўнасьць у колгасах на сваю карысьць, а другія жадаюць выгнаць з колгасаў гэтыя пэражыткі і гэтую няроўнасьць. Хіба-ж не зразумела, што толькі сьляпыя няздольны бачыць розьніцы паміж клясавай барацьбой на базе колгасаў і клясавай барацьбой па-за колгасамі? Было-б памылковым думаць, што калі дадзены колгас дык дадзена і усё патрэбнае для пабудовы соцыялізму. Тым больш памылковым было-б думаць, што члены колгасаў ужоператварыліся ў соцыялістых. Не, прыдзецца яшчэ многа папрацаваць над тым, каб перэрабіць селяніна-колгасьніка, вытравіць яго індывідуалістычную псыхолёгію, зрабіць з яго сапраўднага працаўніка соцыялістычнага грамадзтва. Гэта будзе зроблена тым хутчэй, чым хутчэй будуць колгасы машынізаваны, чым хутчэй яны будуць трактарызаваны. Але гэта нікольки не зьмяншае вялізарнейшага значэньня колгасаў, як вагара соцыялістычнае перабудовы вёскі. Вялізарнае значэньне колгасаў іменна ў тым і заключаецца, што яны зьяўляюцца асноўнаю базаю для ўжываньня машын, трактароў у земляробстве што яны складаюць асноўную базу для пераробкі селяніна, для пераапрацоўкі яго псыхалёгіі ў духу пралетарскага соцыялізму. Ленін меў рацыю, калі ён гаварыў, што „справа пераапрацоўкі дробнага земляроба, пераапрацоўкі ўсяе яго псыхалёгіі і навыкаў,— ёсьць справа, якая патрабуе пакаленьняў. Вырашыць гэта пытаньне адносна да дробнага земляроба, аздаравіць, так сказаць, усю яго псыхалёгію можа толькі матар'яльная база — тэхніка, ужываньне трактароў і машын у земляробстве ў масавым маштабе, электрыфікацыя ў масавым маштабе".

Хто можа адмаўляць, што колгасы зьяўляюцца тою іменна формаю соцыялістычнае гаспадаркі, пры дапамозе якой толькі і можа карыстацца многамільённае дробнае сялянства машынамі і трактарамі, як вагарамі гаспадарчага ўздыму, як вагарамі соцыялістычнага разьвіцьця сельскае гаспадаркі. Аб усім гэтым забылі нашы „левыя" фразёры. Забыўся аб гэтым і наш прамоўца.

(Канец будзе)

Ільназагатоўкі

Дырэктыва ня выканана

Магілеўшчына, Аршаншчына, Мазыршчына і Полаччына ня выканалі плянаў

15 дзён студзеня скарыстаць для поўнага выкананьня гадавога заданьня

НА 1 СТУДЗЕНЯ ВЫКАНАНА 68,8 ПРОЦ. ГАДАВОГА ЗАДАНЬНЯ

Плян загатовак ільну валакна за сьнежань месяц па БССР выкананы на 101,4 проц. (за выключэньнем Магілеўскай акругі)

Па асобных акругах ільну-загатоўкі ідуць наступным чынам: па Бабруйскай акрузе — 166,2 проц., Віцебскай акрузе—119.2 проц., Аршанскай—74,9 проц., Гомельскай - 121,3 проц., Мазырскай акрузе—74,5, Менскай—121,7 проц. і Полацкай—98,3 проц.

Гадавы плян на 1-е студзеня выкананы толькі на 68,8 проц. Такім чынам траба сказаць, што заданьне—80 проц. на 1-е студзеня па загатоўках ільну-валакна ня выканана. Яшчэ да гэтага часу адстаюць у загатоўках: Мазырская акруга, якая выканала 48,5 проц., Полацкая—49,7 проц., і Магілеуская—58,9 проц., гадавога заданьня.

Партыйныя, комсамольскія і грамадзкія організацыі павінны разгарнуць шырокую работу з такім разьлікам, каб гадавое заданьне па ільну-валакну было выканана за студзень месяц.

БРЫГАДЫ НА ІЛЬНОЗАГАТОЎКІ

Па Віцебскаму раёну праводзіцца ўдарная праца па выкананьню ільну-загатоўчых плянаў. Райкомам комсамолу і райвыканкомам пасланы ўдарныя брыгады ў вёскі для правядзеньня працы па ільнозагатоўках. У Старасельскім сельсавеце створана ўдарная брыгада з 80 чалавек, у якую ўвайшлі комуністы, комсамольцы настаўнікі і коопэратыўны актыў. „Лёгкая кавалерыя" занялася справай выкрыцьця заможных гаспадарак і злосных нездатчыкаў лішкаў ільнавалакна. У працягу двух дзён бедняцка-серадняцкая частка сялянства здала добраахвотна каля 500 пудоў ільнувалакна. Старасельскі сельсавет выклікаў на соцыялістычнае спаборніцтва Астравенскі сельсавет.

Астравенскі сельсавет прыняў выклік і склаў брыгаду з 38 асоб. У кожнай вёсцы створаны групы садзейнічаньня па правядзеньню ільназагатовак, якімі выяўлена 1000 пудоў валакна. Організаван чырвоны абоз, які здаў 355 пудоў хлеба і ільнувалакна. У час правядзеньня сходу па ільнузататоўках сяляне вёскі Горкі узьнялі пытаньне аб організацыі колгасу, і ў выніку організаваны колгас, які аб'яднаў 75 бядняцка-серадняцкіх гаспадарак, на плошчы 800 гэктараў.

Горш абстаіць справа па выкананьню плянаў Сініцкім сельсаветам. Ня гледзячы на тое, што гэты сельсавет зьяўляецца ільнаводным, ў памянутым сельсавеце ёсьць 62 гэктары законтрактаванага ільну, дзе з 775 пудоў на 16 сьнежня загатоўлена толькі 375 пуд. Спажывецкае таварыства павінна загатовіць 300 пудоў, а на 22-е сьнежня загатоўлена толькі 45 пудоў.

Колгас Крыпліна законтрактаваў 3 гэктары ільнувалакна, але і па сёньняшні дзень ня прыняў захадаў аб здачы яго дзяржаўным загатаўцелям. Старшыня Сініцкага сельсавету т. Сянькевіч кажа. „Сходы мы праводзілі, але сяляне ільнавалакно не вязуць, а заставіць іх мы ня можам". Старшыня КСУ Лосяў, ён-жа комсамолец, кажа: „Лен вам ніхто не здасьць, таму што ён патрэбен сялянам самім". Комсамольская ячэйка яго выключыла з комсамолу. Старшыня Астравенскага Сельска-Гаспадарчага Крэдытнага Таварыства Кладзько сядзіць сабе спакойна і не выяжджае да контрактаўшчыкоў, чым тармозіць справу загатовак. Такія прыклады па раёну і не адзіночны.

Райвыканком своечасова рэагаваў на дзеяньні працаўнікоў, якія спрыялі зрыву загатовак і зьняў іх з працы, як няздольных праводзіць у жыцьцё дырэктыў партыі і ўлады.

І. Курган.

З БЛЕК-НОТУ УДЗЕЛЬНІКАУ ІЛЬНАЗАГАТОВАК

Па Пасеўскім сельсавеце (Стара-Дарожскі раён) загатоўкі ільнавалакна праведзены з посьпехам. Былі выпадкі што жанчыны дабраахвотна прыносілі амаль увесь свой лён. Дзьве жанчыны з вёскі Гасьціно добраахвотна здалі ўвесь што меўся лён дзяржаўнай загатавіцельнай організацыі.

Даўшыц.

* * *

Ільназагатоўкі па вёсцы Воотрава (Копыльскі раён) выканалі з правышэньнем. Замест 175 кілёграм загатоўлена 205. Але акрамя гэтага ў некаторых гаспадарак вёскі яшчэ маюцца лішкі ільну. Крывасельскай коопэрацыі трэба правесьці працу па ільнузагатоўках.

Васковец.

* * *

Юраўскаму сельсавету вызначана загатовіць адну тону ільну, але загатоўкі на сельсавету праходзіць надта слаба, камсамольскія ячэйкі яшчэ не разгарнулі, як сьлед, працы ў гэтым напрамку.

Комсамолец

„Налёт" на „налётчыкаў"

Сэктар друку АПА ЦК КП(б)Б, разам з ЦКК КП(б) і Фрунзаўскім райкомам партыі арганізаваў „налёт" на рэдакцыі цэнтральных газэт па пытаньню праверкі скарыстаньня рэдакцыямі рабселькораўскіх допісаў*).

Аб залежах і халастых выстрэлах

Залежы допісаў маюцца ва ўсіх рэдакцыях.

У меншай меры гэтыя залежы ў „Зьвязьдзе", значна больш у „Рабочим", „Чырвонай Зьмене" і „Савецкай Беларусі", але правафланговым у адносінах залежу допісаў бясспрэчна можа быць названа рэдакцыя газэты „Беларуская Вёска".

У рэдакцыю гэтай газэты паступае ў сярэднім у дзень больш 250 допісаў.

Брыгада, якая вытварала праверку, адзначыла, што ва ўсіх сталох рэдакцыйных працаўнікоў, за выключэньнем стала рэдактара газэты (які вядзе антырэлігійны аддзел) беспарадак, садом і гамора.

Брыгадзір, які знаёміўся з становішчам допісаў у папках юрыдычнага аддзелу газэты „Беларуская Вёска" піша: „... Мы ў юрыдычным аддзеле знайшлі звыш 100 допісаў. Парадку — ніякага, усё раськідана, нідзе толкам нічога ня знойдзеш".

Ёсьць допісы, прысланыя ня толькі з маркамі, але разам і з канвэртамі, паперай і загадзя напісанымі адрасамі.

У папках юрыдычнага аддзелу брыгадзір на выбарку прачытаў 7 допісаў запытаньняў, з якіх тры з шматлікімі калектыўнымі подпісамі і з маркамі для адказу. але... але гэтыя запытаньні так і засталіся без адказу.

50 допісаў, якія закранаюць пытаньні кулацкіх вылазак, паведамляюць аб контр-рэвалюцыйнай агітацыі ня толькі, ня зьмешчаны. але не абагулены і нават у рэдакцыі не прачытаны.

У газэце „Чырвоная Зьмена"—291 допісы+300 вершаў+170 розных запытаньняў (у сярэднім газэта атрымоўвае ў дзень 90—120 допісаў. Хаваньне матар'ялаў ва ўсіх сэктарах, за выключэньнем саюзнага — ня зусім добрае. У кожным нумары газэты зьмешчаецца 17-20 рабселькораўскіх допісаў).

Не абавязкова, зразумела, каб газэта зьмешчала на сваіх старонках увесь атрымоўваемы матар'ял.

Але абавязкова, каб газэта забясьпечыла поўнае, вычэрпальнае скарыстаньне (у той, ці іншай форме) хвалі карэспандэнцый, каб была забясьпечана дзейнасьць допісаў—гэтай адной з рашаючых артэрый газэтнай крывазваротнай сыстэмы.

У чым „гвоздь" пытаньня?

„Гвоздь" пытаньня, зразумела, у сыстэме работы, ва ўменьні рацыянальна, дарэшты вычарпаць магчымасьці, якія, праўда, іншы раз у нас вельмі абмежаваныя (мала кваліфікаваных працаўнікоў, памяшканьні рэдакцый не забясьпечваюць нармальных умоў работы: „Беларуская Вёска", напрыклад, знаходзіцца ў памяшканьні, якое больш падобна на камэру для арыштаваных, чым на рэдакцыю газэты і г. д.).

Нашы газэты не праявілі і не праяўляюць неабходнай напорыстасьці ў ажыцьцяўленьні спэцыяльнай пастановы прэзыдыуму ЦКК аб парадку скарыстаньня рабселькораўскіх допісаў.

У значнай частцы рэдакцый, аб гэтай пастанове ЦКК,—пастанове, якая побач з прынцыповым абгрунтаваньнем пытаньня намячае шэраг дзелавых мерапрыемстваў — запамяталі, ня ведаюць.

Правільнымі зьяўляюцца мерапрыёмствы газэты „Зьвязда", якая яшчэ да нашага „налёту" сам стойна практыкавала сіламі рабкораў і масавага аддзелу „налёты" унутры рэдакцыі газэты, своечасова мерапрыёмствы газэты „Рабочий", дзе ўводзіцца ў сыстэму прымацаваньне да пэўных аддзелаў рабочых брыгад, якія-б прыглядаліся дапамагалі разам з усім рэдакцыйным калектывам, за тым, каб кожны допіс у той ці іншай меры быў скарыстаны, быў дзейсьцьвенным, не застаўся без адказу.

У нас кульгае справа з вучотам допісаў і вучотам іх скарыстаньня. Тэхніка вучоту рэзка адстае ад тэмпу работы рабселькораў.

Гробакапацелі самакрытыкі

„Налёт" з надзвычайнай чоткасьцю выявіў яшчэ адно слабое зьвяно ў сыстэме скарыстаньня рэдакцыямі атрымоўваемых допісаў.

Дзесяткі, сотні допісаў ня друкуюцца, а насылаюцца ў адпаведныя ўстановы на расьсьледваньне.

Але бяда ня ў тым, што допісы пасылаюцца на расьсьледваньне, а бяда ў тым. што фактычна амаль адсутнічае кантроль наколькі хутка і вычэрпальна расьсьледваны той ці іншы допіс, наколькі рашуча ажыцьцёўлены па допісу неабходныя мерапрыёмствы.

Па газэце „Чырвоная Зьмена" з 400 допісаў, пасланых за апошні год на расьсьледваньне, адказы атрыманы толькі на 23 процанты.

Ёсьць факты, калі навят, Прокуратура і РСІ затрымліваюць па 1½—2 месяцы адказы па допісы, пасланыя да іх на расьсьледваньне.

Красамоўны той факт, што адзін допіс „ехаў" з ЦП прафсаюзу хэмікаў да рэдакцыі газэты „Зьвязда" ня больш і ня менш. як два месяцы.

Вось, сапраўды, класычная беспрасадачная, „плацкарта" бюрократызму і валакіты.

Патрэбна ўдыхнуць жыцьцё ў работу бюро расьсьледваньняў, патрэбна зрабіць іх баявымі, напорыстымі, аўторытэтнымі, апіраючыміся ў сваёй рабоце на кадры актыву, на брыгады „таўкачоў".

У большай меры патрэбна скарыстоўваць супроць гробакапацеляў моц друкаванага слова.

Трэба друкаваць сьпісы ўстаноў і асоб, якія хворы ў адносінах „запораў" па расьсьледваньню заметак, злосна і бяз лістана выкрываць і бічаваць „канкрэтных насіцеляў зла".

А. Курцік.

*) Артыкул т. Курціка „Налёт" на „налётчыкаў" друкуецца ў скарочаным выглядзе.

Зьлёт „Лёгкай Кавалерыі"

КОЙДАНАЎСКАГА РАЁНУ

11 студзеня 1930 г., а 10 гадз. раніцы ў мястэчку Койданава (нардом) склікаецца раённы зьлёт „ЛК" з абвесткай дню:

1. Вясеньняя пасеўкампанія і колектывізацыя раёну (Жалкоўскі).
2. Задачы організацыі, роля і мэтады работы „ЛК" (Палей).
3. Выбары раённага штабу „Лёгкай Кавалерыі"
4. Выбары на ўсебеларускі зьлёт.

Сэкратар РК КСМ ПАЛЕЙ.

---

4 студзеня 1930 г., а 7 гадз. увечары ў памяшканьні ЦК ЛКСМБ адбудзецца пасяджэньне цэнтральнага штабу па правядзенью 3 хмесячніку беларускай пролетарскай культуры і культуры нацменшасьцяў з наступным парадкам дня:

1. Паведамленьне ЦП саюзу працасьветы аб мерапрыемствах па ўдзелу асьветнікаў у 3-хмесячніку (т. Рычкоў).
2. Паведамленьне Бел АППу аб мерапрыемствах па ўдзелу ў 3 хмесячніку (т. Мурашка).
3. Плян работы штабу (т. Шоламаў).
4. Мерапрыемствы па ўдзелу піонэрарганізацыі ў 3-хмесячніку (т. Рывін).
5. Аб лёзунгах, плякатах і рэкляме 3-хмесячніку.
6. Аб стварэньні сэкцыі пры штабе.
7. Аб вылучэньні пяцёркі для кіраўніцтва бягучай работай.

На пасяджэньне выклікаюцца наступныя т. т. Сянькевіч, Платун, Клімковіч, Рычкоў, [illegible]екрашэвіч, Будзінскі, Галавач, Шыпіла (БДВ), Ігнатоўскі, Галкін (Белдзяржкіно), Каплан, Каранеўскі (БДУ). Саевіч, Папова (ЦП працмастацтва), Шамшур, Харкаў, Бедынэрман, Рывін, Самуцін, Дубравіцкі, Шастакоў (рэдакцыя „Савецкая Беларусь", Дунец (газэта „Акцябр"), Рубінчык, Перагуд, Гефэн, Мухін (т-ва ПН), Чарот, Грыцкевіч (ЦБ пролетстуда). Прынц (Орка), Леў, Наўменак (радыё-цэнтр). Бычкоўскі (з-д „Бальшавік"), Купрыянаў (камітэт выстаўкі), Такарчук („Зьвязда").

Начальнік штабу Шоламаў.

Курсы хатачоў

Колегія Наркомасьветы ўхваліла організаваць у 1930 годзе трохмесячныя курсы (з 1-га мая па першае жніўня) для падрыхтоўкі работнікаў для хатчытален. На курсы будзе прынята 100 чалавек.

Падрыхтоўка кіно-кадраў

Колегія Наркомасьветы запрапанавала Белдзяржкіно супольна з Белкоопсаюзам і Белколгассаюзам організаваць каротка-тэрміновыя курсы падрыхтоўкі кіно-кадраў для абслугоўваньня кіно-перасовак і стацыянарак у раёнах суцэльнай колектывізацыі.

КОНКУРС НА ЛЕПШУЮ ДЗІЦЯЧУЮ КНІЖКУ

Культсэктарам Беларускага Дзяржаўнага Выдавецтва гэтымі днямі будзе абвешчан усебеларускі конкурс на лепшую дзіцячую кніжку. Мэта конкурсу: стварыць беларускую пролетарскую дзіцячую кніжку, прыцягнуць старых пісьменьнікаў і выявіць новыя кадры ў гэтай працы.

Датэрміновы выпуск 4-га курсу польпэдтэхнікуму

У сувязі з недахопам настаўнікаў для польскіх школ, колегія Наркомасьветы прызнала магчымым утварыць 15-га студзеня 30 году датэрміновы выпуск 4-га курсу Менскага польпэдтэхнікуму. Адначасова ў Менску будуць організаваны 6-ці месячныя курсы для падрыхтоўкі настаўнікаў для вясковых польскіх школ разьлічаныя на 30 асоб.

З фотоапаратам па Менску



Першая лыжная вылазка чырвонаармейцаў № стралковага палка.

Да 3-месячніка беларускай пролетарскай культуры

Культсэктарам Беларускага Дзяржаўнага Выдавецтва рыхтуецца да 3-х месячніку беларускай і нацменшасьцяў пролетарскай культуры кніжка пад рэдакцыяй АПА ЦК ЛКСМБ пад назвай „У дапамогу ячэйцы у правядзеньні 3-х месячніка".

Па тэлефону 12-19

Сход рабочых шорнай фабрыкі „Усход" пастанавіў хадатайнічаць перад Гарсаветам аб перадачы пустуючай сынагогі, што знаходзіцца каля фабрыкі—пад клюб,

Ф,

Паштовая скрынка

Ганчарову—„Аб культурных сілах на вёсцы", Якуб Бярозка—„Працу ажывіць", Н.Т.—„Як праводзіцца колектывізацыя ў нашай вёсцы",—вашы допісы зьмешчаны ня будуць. Аб закранутых вамі пытаньнях раім пісаць у насьценныя газэты.

Юнкору — „Погляды настаўнікаў", Крапіўка—„Аб варожай ідэолёгіі"—вашы допісы пасланы на расьледваньне.

Кацовічу — „Конфлікт Фекоўскай", Ведаючаму—„Шовінізм і антысэмітызм у Беразьнянскай сямігодцы", Зайдман — „Правы ухіл на практыцы ОСФ", Дрожыну — „Комсамольская ячэйка сьпіць" і Трыцецку — „Партячэйка кульгае" — накіраваны ў адпаведныя органы для расьсьледваньне.

Зайцаву—„Палітычны суд", Івашкевічу, „Разважаньні аб антысэмітызьме", Бікману—„Ліст у рэдакцыю", Вербалозьніку—„Прэч з комсамолу падкулачных ідэолёгаў", Чарот Аозка—„Сэкратар ячэйкі, — правы ўкланіст" Рабфакаўцу —„Аб Сорыну" Вашы допісы друкавацца ня будуць, напішэце аб гэтым у насьценную газэту.

Казлоўскаму — „Аб правых загібах у нашай партыі" друкавацца ня будзе, бо толькі адны разважаньні бяз фактаў.

Хамковічу „Добры працаўнік", Мураўёву Я., „Няпісьменным", Чачотку, „Сельсаветы заняпалі", Адліванчыку, „Клясавы вораг абараняецца", Санаву, „Узмацнім антырэлігійную пропаганду", В. Л., „Дзе новыя мэтады", Падсьнежніку — „Прапойскі школьны савет сьпіць", Горкаму перцу — „А што будзе далей", АК „Справа ў комунах", Чобару—„У пале ваду носіць", Бязбожніку — „Гурток бязбожнікаў бязьдзейнічае".—Вашы допісы ня пойдуць, як дробязныя. Аб закранутых вамі фактах раім напісаць у насьценнай газэце.

С. Г.—„Што чытаць".—ня пойдзе, ты з узятай тэмай ня справіўся Корчу—„Культмасавы працаўнік"—ня пойдзе, дробязь

К. К.—„Не настаўнік, а жандар", Бандарчык—„Шко а Нарлому", Сяўлеву, „Нядбайныя адносіны настаўнікаў", Чачотку — „Студэнты на гутарцы ксяндза". Янку—„Клясавая лінія ў школе парушана". Чачотку — „Палепшыць выхаваньне", Комсамольцу— „Крызіс на соль", Заслаўскаму—„Вылазка клясавага ворага", Янку Муха — „Чаму кулак не абкладзен індывідуальна", „Кулак наперадзе", „Прымусць кулакоў заплаціць вайсковы падатак", „Член сельсавету разводзіць плёткі", „З каго-ж узяць, калі ня з вас", „Будзь дома без цябе абойдуцца там". „Сьнеданкамі кормяць", Комсамольцу—„Аб жыцьці студэнтаў Мазырскага ПТ", Вучню—„Кепскія адносіны настаўнікаў да вучняў". Кавалерыстаму—„Бюрократычныя адносіны да працы", Прысутнічаючы—„Камуна не па душы", Івану Круну — „Багі яшчэ ёсьць у Воршы", Верасу—„Узмацнім работу ў машынных таварыствах". Вашы допісы перасланы для расьсьледваньня і прыняцьця належных захадаў.

Ад рэдакцыі: Рэдакцыя папярэджвае ўсіх юнкораў, што допісы прысланыя бяз сталага адрасу зьмяшчацца ня будуць.

Нам пішуць

У наказе Барысаўскаму Горсавету амаль усе сходы рабочых гаварылі аб электрафікацыі гарадзкіх акраін. Горсавет абяцаў з пускам новай электростанцыі пры фабрыцы „Чырвонай Бярэзіны" даць сьвет акраінам.

Станцыя ўжо працуе, а на акраінах сьвету няма Трэба Горсавету успомніць наказ рабочых

Г. Кугель.

Адказны рэдактар А. Джэлюк

Менск, друкарня БДВ. Галоўлітбел 599